# Абмеркаванне змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь на старонках газеты «Звязда»

*Канюта В. І., асп. БДУ,*
*навук. кір. праф. Падаляк Т. У., д-р філал. навук, дац.*

Бягучы 2022 г. не паспеў пачацца, а ўжо ўвайшоў у гісторыю Беларусі. Найважнейшай грамадска-палітычнай падзеяй стала правядзенне рэспубліканскага рэферэндуму па пытанні ўнясення змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь. На ўсенароднае галасаванне было вынесена наступнае пытанне: «Ці прымаеце Вы змяненні і дапаўненні Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь?»

Рэферэндуму папярэднічала грунтоўная падрыхтоўчая работа, галоўнай мэтай якой было патлумачыць насельніцтву сутнасць наваўвядзенняў у Асноўны Закон краіны. Першапачатковы праект змяненняў і дапаўненняў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь у сродках масавай інфармацыі, а таксама на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале быў апублікаваны 28 снежня 2021 г. Законапраект прадугледжваў усенароднае абмеркаванне, да якога мелі магчымасць падключыцца ўсе паўналетнія беларусы, незалежна ад іх грамадскага становішча. Абноўлены варыянт Канстытуцыі актыўна абмяркоўваўся на шматлікіх дыялогавых пляцоўках, грамадскіх прыёмах, якія ладзіліся ва ўсіх рэгіёнах краіны.

У шырокую работу па тлумачэнні сутнасці змяненняў і дапаўненняў у Асноўны Закон, іх важнасці і неабходнасці ўключыліся і сродкі масавай інфармацыі. Не стала выключэннем і рэспубліканская газета «Звязда». Апублікаваны праект змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю карыстаўся папулярнасцю ў чытачоў перыядычнага выдання: на сайце «Звязды» поўны тэкст прапанаванага дакумента доўгі час трымаўся ў лідарах па праглядах. У друкаванай версіі з’явілася новая рубрыка – «Канстытуцыя: у фармаце абмеркавання», дзе з нумара ў нумар публікавалася аналітыка ад экспертаў. Падключыцца да абмеркавання, а таксама ўнесці свае прапановы ў дакумент маглі і чытачы «Звязды»: дастаткова было напісаць аб гэтым у рэдакцыю або напрамую ў арганізацыю, якая акумулявала і аналізавала ўсе заўвагі і прапановы, – Нацыянальны цэнтр прававой інфармацыі.

Амаль месяц, з 29 снежня 2021 г. па 21 студзеня 2022 г., на старонках перыядычнага выдання ішло актыўнае абмеркаванне законапраекта, да якога падключыліся вядомыя дзеячы і эксперты, асвятляліся мерапрыемствы, звязаныя з гэтай найважнейшай грамадска-палітычнай падзеяй. Сваімі меркаваннямі наконт маючых адбыцца змяненняў і дапаўненняў дзяліліся члены Савета Рэспублікі, дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, прадстаўнікі дзяржаўных органаў, раённай улады, палітычныя і грамадскія дзеячы, журналісты, палітолагі, рабочыя і спецыялісты, маладыя жыхары нашай краіны.

Шэраг навацый у Канстытуцыю, вынесеную на грамадскае абмеркаванне, атрымаў у грамадстве асаблівы рэзананс. У прыватнасці, упершыню на дзяржаўным узроўні замацоўвалася палажэнне (артыкул 15) аб тым, што «дзяржава забяспечвае захаванне гістарычнай праўды і памяці аб гераічным подзвігу беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны» [1]. На думку гісторыка Вячаслава Селяменева, гэта вельмі своечасова. Вось што ён адзначыў у інтэрв'ю газеце «Звязда»: «Раней нават пытанняў на гэтую тэму не ўзнікала. Памяць аб вайне, ушанаванне подзвігу савецкага народа з'яўлялася аксіёмай. Усё памянялася. Тыя падзеі з кожным годам аддаляюцца ад нас. Для сучаснага пакалення беларусаў Вялікая Айчынная вайна – гэта нешта далёкае, нават старажытнае ў адрозненне ад пакалення нашага, чые бацькі былі непасрэднымі ўдзельнікамі тых падзей» («Звязда». 2022. 5 студзеня).

Артыкул № 32 абноўленага Асноўнага Закона ўстанаўлівае, што «дзяржава садзейнічае духоўнаму, маральнаму, інтэлектуальнаму і фізічнаму развіццю моладзі, стварае неабходныя ўмовы для яе свабоднага і эфектыўнага ўдзелу ў грамадскім жыцці, рэалізацыі патэнцыялу моладзі ў інтарэсах усяго грамадства» [1]. Новая канстытуцыйная норма, якая датычыцца моладзі, закладвае аснову канструктыўнага ўзаемадзеяння маладых людзей і грамадства. Як падкрэсліў старшыня Канстытуцыйнай камісіі, старшыня Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь Пётр Міклашэвіч, «гэтая норма дазволіць моладзі ўсебакова развівацца і годна адказваць на выклікі часу, а дзяржаве – уцягваць моладзь у вырашэнне важных грамадскіх і дзяржаўных задач, выхоўваць маладых патрыётаў, адказных за сучаснасць і будучыню краіны» («Звязда». 2022. 6 студзеня).

Асаблівую цікаўнасць у беларусаў выклікала дапаўненне ў 45-ы артыкул Канстытуцыі, якое паведамляе, што «грамадзяне клапоцяцца аб захаванні ўласнага здароўя». Некаторыя жыхары ўспрынялі гэтую навацыю ў кантэксце таго, што медыцынскае абслугоўванне стане платным. Экспертам і спецыялістам у сферы аховы здароўя давялося неаднаразова тлумачыць, што насамрэч азначае гэтае дапаўненне. Па словах генеральнага сакратара Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа Дзмітрыя Шаўцова, «калі такая адказнасць за захаванне свайго здароўя будзе прапісана ў Канстытуцыі, мы зможам павярнуць чалавека тварам да тых праблем, якія ў яго ёсць. Тут можна казаць пра абавязак выконваць рэкамендацыі медыцынскіх работнікаў» («Звязда». 2022. 25 студзеня).

Асобная глава ($3^1$) у Канстытуцыі на заканадаўчым узроўні замацоўвае новы дзяржаўны орган – Усебеларускі народны сход і рэгламентуе яго дзейнасць. Гэта «найвышэйшы прадстаўнічы орган народаўладдзя Рэспублікі Беларусь, які вызначае стратэгічныя напрамкі развіцця грамадства і дзяржавы, забяспечвае непахіснасць канстытуцыйнага ладу, пераемнасць пакаленняў і грамадзянскую згоду» [1]. Вялікая работа па тлумачэнні

функцый Усебеларускага народнага сходу была зроблена газетай «Звязда»: кампетэнтнае меркаванне экспертнага асяроддзя рэгулярна адлюстроўвалася на старонках выдання. Цыкл публікацый таксама быў прысвечаны іншым дапаўненням і змяненням у Асноўны Закон краіны.

Законапраект выклікаў рэзананс у беларусаў. Аб гэтым сведчыць той факт, што свае прапановы наконт дапаўненняў і змяненняў у Асноўны Закон у Канстытуцыйную камісію даслалі амаль дзевяць тысяч грамадзян. Рэферэндум адбыўся. Найбольшая яўка грамадзян была зафіксаваная ў асноўны дзень галасавання – 27 лютага 2022 г. У выніку за новы варыянт Канстытуцыі прагаласавала 82,86% выбаршчыкаў, якія прынялі ўдзел у рэферэндуме (або 65,16% ад грамадзян, унесеных у спісы для галасавання). Абноўлены Асноўны Закон краіны ўступіў у сілу 15 сакавіка 2022 г. – у Дзень Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. Як заўважыў кіраўнік дзяржавы, «гэта Канстытуцыя будучыні. Самае галоўнае – у найбліжэйшыя два-тры гады навучыцца жыць па законе» («Звязда». 2022. 22 студзеня).

**Літаратура**

1. Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь са змяненнямі і дапаўненнямі [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://pravo.by/pravovaya-informatsiya/normativnye-dokumenty/konstitutsiya-respubliki-belarus. – Дата доступу: 20.03.2022.

# Коллективная травма в романе Чинуа Ачебе «Стрела Бога»

*Карпиевич А. А., студ. V к. БГУ,*
*науч. рук. Бутырчик А. М., канд. филол. наук, доц.*

Одним из факторов, определяющих изначальное развитие нации в постколониальный период, является наличие коллективной травмы, способной объединить людей. Артур Нил *(Arthur Neil)* выделяет понятие «национальной травмы», имеющей «долгосрочные последствия, от которых непросто избавиться и которые будут воспроизводиться в сознании индивида, прочно укореняясь в коллективной памяти» (перевод здесь и далее – Н. Поселягина) [1]. Исследователь Рон Айерман *(Ron Eyerman)* пишет, что «национальная или культурная травма (на теоретическом уровне разница между ними минимальна) укоренена в событии или серии событий, но не обязательно в их непосредственном переживании. Этот опыт обычно опосредован, например, газетами, радио и телевидением, что создает пространственно-временную дистанцию между событием и его переживанием» [2]. Рецепция травматического опыта, по мнению Р. Айермана, зависит от репрезентации, если точнее, от актора, конструирующего воображаемую ситуацию переживания: «это